за хлеб. Геаграфія матэрыялаў гэтага цыкла аказалася на дзіва шырокай. Карэспандэнт сустракаўся з многімі камбайнерамі гаспадарак Случчыны, шафёрамі грузавых аўтамашын, якія адвозілі збожжа з палявых брыгад, аграномамі, брыгадзірамі, хлебаробамі раёна, якія дабіліся высокіх паказчыкаў пры ўборцы ўраджаю.

На старонках «Савецкай Радзімы» змешчана шмат крытычных матэрыялаў Б. Стральцова. Яны таксама напісаны жыва, пераканаўча. Нярэдка ў матэрыялах прысутнічаюць элементы замалёўкі, рэпартажа. У адпаведнасці з задачамі гэтых публікацый падбіраўся і тон загалоўкаў: «Без кантролю і дапамогі» (Сав. Радзіма, 1953, 20 лют.), «Неапраўданы спакой» (Сав. Радзіма, 1953, 3 крас.), «Абавязацельствы трэба выконваць» (Сав. Радзіма, 1953, 14 крас.) і інш. А калі крытычнага напалу, на думку журналіста, не хапала, у ход ішоў такі жанр, як фельетон. Пад рубрыкай «Фельетон» у газеце з’явілася публікацыя «Бюракраты» (Сав. Радзіма, 1953, 14 чэрв.). Пад агонь знішчальнай крытыкі трапілі чыноўнікі Кіраўскага раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння, што, па сутнасці, здзекаваліся з інваліда працы І. Дужынскай, якая хадайнічала аб назначэнні пенсіі. І толькі вострае выступленне газеты змагло спыніць «блуканні па пакутах» 60-гадовай пенсіянеркі.

Творчыя дасягненні Б. Стральцова на старонках газеты «Савецкая Радзіма» не засталіся без увагі арганізатараў СМІ. У савецкі час лепшым супрацоўнікам мясцовых выданняў, якія атрымлівалі там грунтоўную загартоўку, быў адкрыты прамы шлях у рэспубліканскія выданні. Таленавітага журналіста, які на практыцы, а пазней у навуковых даследаваннях распрацоўваў тэорыю жанраў айчыннай публіцыстыкі, у 1953 г. запрасілі на працу ў «Чырвоную змену», а ў 1958–1969 гг. ён працаваў спачатку літработнікам, а потым загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва рэдакцыі газеты «Звязда».

## РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПРЭСА БЕЛАРУСІ ЯК АБ’ЕКТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

***Т. М. Дасаева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Dasaeva@bsu.by*

Сістэматызуюцца навуковыя даследаванні выкладчыкаў факультэта журналістыкі БДУ, прысвечаныя рэгіянальнай прэсе Беларусі. Вызнача-

юцца напрамкі даследаванняў. Ацэньваецца іх навуковае і практычнае значэнне.

***Ключавыя словы:*** рэгіянальная прэса; лічбавыя тэхналогіі; трансфармацыя медыясістэмы; мадэрнізацыя рэгіянальнай прэсы.

## REGIONAL PRESS OF BELARUS AS AN OBJECT OF SCIENTIFIC RESEARCH

***T. N. Dasaeva***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: T. N. Dasaeva (Dasaeva@bsu.by)*

The teacher research of the faculty of journalism of BSU on the regional press of Belarus is systematized. Research directions are defined. Their scientific and practical significance is evaluated.

***Key words:*** regional press; digital technologies; transformation of the media system; modernization of the regional press.

Навукова-даследчая праца – важны напрамак прафесійнай дзейнасці выкладчыкаў факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. На факультэце рэгулярна праводзяцца міжнародныя і рэспубліканскія агульнафакультэцкія і кафедральныя навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, круглыя сталы з удзелам прадстаўнікоў Міністэсртва інфармацыі, навукоўцаў, журналістаў-практыкаў і інш. Выдаюцца зборнікі матэрыялаў і навуковых прац гэтых журналісцкіх форумаў. Акрамя таго, навуковыя артыкулы выкладчыкаў і аспірантаў друкуюцца ў спецыялізаваным выданні «Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика. Педагогика» (да 2018 г. – «Веснік БДУ. Серыя 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка»).

Кожная факультэцкая кафедра выконвае навукова-даследчую працу па сваім профілі. Разам з тым навуковая зацікаўленасць выкладчыкаў факультэта журналістыкі не абмяжоўваецца абазначанымі ў кафедральных тэмах праблемамі. Так, аб’ектам навуковага даследавання многіх выкладчыкаў факультэта журналістыкі з’яўляецца рэгіянальная прэса Беларусі, якая асэнсоўваецца ў розных ракурсах.

А. Слука, Н. Зубчонак, П. Дарашчонак разглядаюць рэгіянальную прэсу ў гістарычным аспекце, у кантэксце станаўлення і развіцця нацыянальнай сістэмы сродкаў масавай інфармацыі. А. Градзюшка прасочвае прасоўванне рэгіянальнай прэсы ў інтэрнэце [1], асэнсоўвае лічбавыя тэхналогіі ў працы журналістаў рэгіянальных газет Беларусі, разглядае журналісцкі тэкст ва ўмовах медыятрансфармацыі, выяўляе станоўчыя і адмоўныя фактары ў журналісцкай дзейнасці ў эпоху лічбавых тэхналогій; уздымае пытанні падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне інтэрнэт-журналістыкі ў сувязі з забеспячэннем рэдакцый рэгіянальных газет новымі кадрамі; абгрунтоўвае тэзіс аб «актуальнасці навуковых даследаванняў, прысвечаных трансфармацыі медыяасяроддзя ва ўмовах глабальнай лічбавізацыі» [1, с. 29].

У публікацыях А. Патрэбіна і А. Красоўскай даследуюцца навуковыя падыходы да вывучэння рэгіянальнай медыясістэмы, асэнсоўваецца пытанне аб выбары аптымальнай метадалогіі даследавання: «Мадэрнізацыя медыясістэмы Віцебскай вобласці: друкаваныя выданні» (А. Патрэбін), «Рэгіянальная медыясістэма як складаны сістэмны аб’ект» (А. Красоўская). А. Красоўская асэнсоўвае таксама іміджавы патэнцыял беларускай рэгіянальнай прэсы; разглядае беларускія рэгіянальныя выданні ў глабальным кантэксце.

А. Свораб, Д. Сіняўскі, С. Харытонава даследуюць дызайн рэгіянальных газет. У полі зроку кожнага з іх свой ракурс агульнай праблемы, аб чым сведчаць назвы іх навуковых публікацый. Нарыклад, «Канцэптуальная графіка рэгіянальнага выдання: новыя прыкметы», «Ілюстрацыя ў графічным кантэксце газеты звышмалога фармату (А4)» (А. Свораб); «Архітэктоніка першых палос рэгіянальных газет», «Недахопы дызайну рэгіянальных выданняў» (Д. Сіняўскі); «Лагатып раённай газеты: тэндэнцыі тыпаграфікі (на матэрыяле газет Магілёўскай вобласці)», «Глабалізацыя газетнага дызайну» (С. Харытонава).

Фотажурналістыка лічбавай эпохі асэнсоўваецца В. Шымоліным, К. Гуртавой. Н. Саянава прасочвае жанрава-тэматычную трансфармацыю раённай прэсы. Д. Драздоў разглядае менеджмент рэгіянальнай прэсы. Праблемы культуры маўлення журналіста рэгіянальнай газеты, моўную палітру раённай прэсы даследуюць В. Самусевіч, П. Жаўняровіч, С. Берднік.

Неабходна адзначыць, што асаблівая ўвага даследаванню рэгіянальнай прэсы Беларусі надаецца кафедрай перыядычнага друку і вэб-журналістыкі (да 2018 г. – кафедра перыядычнага друку). На су-

часным этапе па замове Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь калектыў кафедры выконвае навукова-даследчую працу «Дзяржаўныя рэгіянальныя друкаваныя сродкі масавай інфармацыі ў працэсе трансфармацыі нацыянальнай медыясістэмы (маніторынг стану і распрацоўка эфектыўнай мадэлі развіцця» (2018–2020 гг.).

У 2018 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь былі арганізаваны семінар «Рэгіянальныя выданні ў сучаснай медыясферы» для кіраўнікоў абласных, гарадскіх і раённых газет, які прайшоў у Віцебску (07.05.2018), Гомелі (29.05.2018), Смаргоні (14.06.2018), Магілёве (29.06.2018), Салігорску (07.09.2018), а таксама семінар, праведзены ў рамках выязнога пасяджэння калегіі Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь у Баранавічах (05.04.2018). Выкладчыкі кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі прынялі актыўны ўдзел у гэтых важных мерапрыемствах.

На працягу двух апошніх гадоў абаронены дзве кандыдацкія дысертацыі, аб’ектам даследавання якіх з’яўляюцца рэгіянальныя перыядычныя выданні.

У дысертацыі М. Прахарэні «Камунікатыўная стратэгія рэгіянальнай прэсы Беларусі ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці» (2018) прадстаўлены генезіс канцэпцыі грамадзянскай супольнасці ў грамадска-палітычнай думцы Беларусі; на аснове аналізу архіўных матэрыялаў вызначаны этапы і асаблівасці развіцця сістэмы рэгіянальнага друку; акрэслены напрамкі камунікатыўнай стратэгіі рэгіянальнай прэсы ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці; раскрыты трансфармацыі жанравых форм рэгіянальных выданняў, іх уплыў на фарміраванне кантэксту.

У дысертацыі Д. Нікановіча «Газетны кантэнт ва ўмовах трансфармацыі нацыянальнай медыясферы: адаптацыя і мадэляванне» (2019) засяроджваецца ўвага на такіх аспектах тэорыі і метадалогіі журналістыкі, як навуковая арганізацыя журналісцкай творчасці і работы рэдакцыі, тэхналогія стварэння газетнага кантэнту, медыяменеджмент і медыямаркетынг, медыяканвергенцыя, кросмедыйнасць і мультымедыйнасць.

Абодва дысертацыйныя даследаванні адпавядаюць прыярытэтным даследчым напрамкам на 2016–2020 гг., зацверджаным Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 190 ад 12 сакавіка 2015 г. (п. 11 «Грамадства і эканоміка», п. 12 «Міждысцыплінарныя даследаванні», п. 13 «Бяспека, грамадства і дзяржава»).

Такім чынам, вынікі навуковых даследаванняў рэгіянальнай прэсы, якія ажыццяўляюць выкладчыкі факультэта журналістыкі Беларуска-га дзяржаўнага ўніверсітэта, садзейнічаюць далейшай распрацоўцы метадалогіі даследавання функцыянавання рэгіянальнай прэсы ў лічбавую эпоху; даюць магчымасць сфармуляваць практычныя рэкамендацыі для рэдакцый рэгіянальных перыядычных выданняў з мэтай мадэрнізацыі іх дзейнасці; акцэнтуюць увагу на неабходнасці далейшага ўдасканалення падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў для рэгіянальных СМІ; садзейнічаюць падрыхтоўцы кадраў вышэйшай кваліфікацыі; знаходзяць укараненне ў навучальным працэсе; выкарыстоўваюцца пры складанні праграм для павышэння кваліфікацыі работнікаў рэгіянальнай прэсы.

### Бібліяграфічныя спасылкі

1. Международная журналистика-2019: евразийско-атлантическое партнерство и медиа : материалы VIII Междунар. научн.-практ. конф., Минск, 21 февр. 2019 г. / Белорус. гос. ун-т, редкол. : Б. Л. Залесский (отв. ред.) [и др.]. Минск: БГУ, 2019. 342 с.
2. Рэгіянальныя СМІ ў сучаснай інфармацыйнай прасторы : матэрыялы Рэсп. навук.-практ. семінара, 2–3 чэрв. 2011 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. 204 с.

## РЕГИОНАЛЬНЫЕ АГРОПРОМЫШЛЕННЫЕ ИЗДАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ: ОПЫТ МОГИЛЁВСКОЙ И БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТЕЙ

***Р. В. Дерюжин***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*romanderrr@mail.ru*

Выявляются особенности содержания, а также направления деятельности агропромышленных изданий Могилевской и Брестской областей. Особое внимание уделено способам повышения эффективности функционирования изданий и продвижению контента в интернет-пространстве.

***Ключевые слова:*** экономика; агропромышленный комплекс; региональное развитие; профориентация; социальные сети.